# КУЛЬТУРНА–АСВЕТНІЦКІЯ ФУНКЦЫІ ПРАВАСЛАЎНАГА ДУХАВЕНСТВА Ў 60–90-Я ГГ. XIX СТ. У БЕЛАРУСІ.

Карповіч Н.В. Мінск, БДУ

Праваслаўнае духавенства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст ва ўмовах актывізацыі царкоўна–прыхадскога жыцця займалася выкананнем шэрагу сацыяльных функцый, у тым ліку і культурна-асветніцкіх. Рэалізацыя ўрадавых мерапрыемстваў ва ўмовах мэтанакіраванай русіфікацыі выклікала актывізацыю культурна–асветніцкай дзейнасці не толькі праз удзел праваслаўнага духавенства ў царкоўных установах, але і далучыла да гэтай справы іншых прадстаўнікоў грамадства.

Упершыню асобныя пытанні культурна-асветніцкай дзейнасці праваслаўнага духавенства ў царкоўна-грамадскіх установах былі закрануты ў працах XIX ст., але яны мелі ўскоснае адлюстраванне [2]. Значна больш увагі гісторыі духавенства стала надавацца ў сучаснай гістарыяграфіі. Фрагментарныя звесткі аб дзейнасці праваслаўнага духавенства ў царкоўных брацтвах і папячыцельствах у перыяд рэформ Аляксандра II былі акрэслены ў даследваннях расійскіх аўтараў А. Палунова, С. Рымскага [7,8]. Сярод беларускіх даследчыкаў асноўныя напрамкі дзейнасці брацтваў беларускіх епархій адзначае С. Васовіч [1], але культурна-асветніцкія функцыі праваслаўнага духавенства ў царкоўна-грамадскіх установах патрабуюць удакладнення.

Менавіта падзеі паўстання 1863–1864 гг. абумовілі неабходнасць умацавання ўплыву царквы на рэлігійна-маральнае выхаванне народа, а таксама імкненне ўрадавых колаў не выпускаць народную асвету з-пад кантролю праваслаўнага духавенства. Таму галоўным напрамкам культурна-асветніцкай дзейнасці праваслаўнага духавенства было пашырэнне народнай адукацыі. Але на працягу

адзначанага перыяду ступень актыўнасці духавенства ў гэтай справе праз царкоўна-грамадскія ўстановы залежыла ад змены прыярытэтаў урадавай палітыкі, а таксама ад функцыянавання саслоўных устаноў духавенства. У пачатку 60-х гг. XIX ст. асветніцкія задачы выконваліся праваслаўным духавенствам ва ўрадавых навучальных установах. У мэтах барацьбы з польскім уплывам духавенства выкладала Закон Божы і іншыя прадметы ў пачатковых школах Міністэрства народнай асветы. Пытанні вырашэння матэрыяльнага забеспячэння духоўных навучальных устаноў, падтрымка асобных вучняў, утварэнне і змены навучальных праграм сталі прадметам абмяркавання саслоўных устаноў духавенства: епархіяльных, акруговых вучылішчных, благачынных з'ездаў. Справамі народнай адукацыі займаліся і царкоўна-грамадскія ўстановы: царкоўна-прыхадскія папячыцельствы і брацтвы. У адрозненні ад папячыцельстваў брацтвы засяроджвалі ўвагу на спалучэнні маральна-рэлігійнага выхавання і пашырэнні пісьменнасці сярод грамадзян. Царкоўныя брацтвы мелі большыя магчымасці для культурна-асветніцкай дзейнасці, паколькі адрозніваліся ад папячыцельстваў экстэрытарыяльным прынцыпам, яны валодалі большай незалежнасцю ў адносінах да епархіяльнага кіравання, ствараліся на больш дэмакратычных пачатках. Дамінуючая роля асоб духоўнага стану ў складзе брацтваў, а таксама абавязковыя ахвяраванні братчыкаў, садзейнічала актывізацыі дзейнасці брацтваў сярод царкоўна-грамадскіх устаноў.

Найбольш эфектыўнай дзейнасцю ў справах народнай асветы вылучалася духавенства Віленскага Свята-Духаўскага і Мінскага Свята-Мікалаеўскага брацтваў, якія ўтварыліся ў 1865 г. Галоўную ролю ў арганізацыі навучальнага працэсу, матэрыяльнага забеспячэнне пачатковых школ, кадравыя пытанні вырашалі спецыяльна створаныя брацкія саветы, якія складаліся з духоўных і свецкіх асоб.. Адсутнасць грашовых сродкаў, недахоп навучальнай літаратуры, а таксама добраадукаваных настаўнікаў стрымлівалі магчымасці функцыянавання брацкіх саветаў. На першым этапе было вырашана падтрымаць царкоўныя брацтвы і штогод выдаткаваць сродкі на справы народнай асветы. Так, Віленскае

Свята-Духаўскае на ўтрыманне школ – 250 руб. штогод, а Полацкае ў імя св. Мікалая і прападобнай княжны Ефрасінні – 450 руб. на стыпендыі ў Полацкай настаўніцкай семнарыі [8, с.368]. Але такая прадвызначаная накіраванасць выкарыстання сродкаў звужала ініцыятыву духавенства ў брацтвах. Так, напрыклад, на матэрыяльныя патрэбы васкрэснай школы ў Мінскай епархіі саветам Мінскага Свята-Мікалаеўскага брацтваў выдаткавалася толькі 25 руб. штогод, што складала нязначную суму [2, с.12]. Дзейнасць духавенства праз царкоўныя брацтвы ў справе пашырэння народнай асветы не вызначалася асаблівым дынамізмам і паступова ў 70-х гг. XIX ст. адбывалася паслабленне яго функцый.

Пасля выдання ў 1884 г. "Правілаў аб царкоўна-прыхадскіх школах" дзейнасць праваслаўнага духавенства у галіне народнай адукацыі актывізавалася. У выніку былі адноўлены Магілеўскае Багаяўленскае (1883 г.) і Віцебскае Свята-Уладзімірскае брацтвы (1887 г.). У мэтах падтрымкі брацтваў на выкананне асветніцкіх задач штогод выдаткоўваліся грашовыя датацыі, што дазваляла пашырыць магчымасці гэтых царкоўна-грамадскіх устаноў. Акрамя таго, найбольшых поспехаў у школьна-асветніцкай дзейнасці ў Беларусі ўдалося дасягнуць дзякуючы выкананню саветамі брацтваў функцый епархіяльных вучылішчных саветаў. У Літоўскай і Магілёўскай епархіях вучылішчныя саветы працавалі разам з брацтвамі толькі на першым этапе. Потым былі створаны самастойныя вучылішчныя саветы. У Мінскай і Полацкай епархіях, наадварот, спачатку былі створаны самастойныя вучылішчныя саветы, якія праз некаторы час зліліся з брацтвамі. Сумеснае іх супрацоўніцтва, на думку епархіяльных кіраўнікоў, павінна было актывізіраваць уплывовых асоб у працэс арганізацыі царкоўна-прыхадскіх школ.

Адной з галоўных функцый брацтваў было ўладкаванне школ і кантроль у іх за навучальна-выхаваўчым працэсам. Саветы брацтваў фінанасавалі будаўніцтва і рамонт школьных будынкаў. У Полацкай епархіі, напрыклад, у 1886/1887 навучальным годзе 132 пачатковыя школы (з 331) былі адчынены толькі на сродкі

асоб духоўнага саслоўя [6, с. 770]. Акрамя таго, праваслаўнае духавенства адлічвала пэўны працэнт са свайго штогадовага заробку на карысць царкоўна-прыхадскіх школаў. Але духавенства не толькі ахвяравала грошы на адзначаныя справы, але прадстаўляла асабістае альбо царкоўнае жылле для ўладкавання памяшканняў для школ. Так, у Магілеўскай епархіі ў1886/1887 навучальным годзе з 271 царкоўна-прыхадскіх школ 34 размяшчалася ў царкоўных памяшканнях, 15 – ў дамах святароў, 13 – псаломшчыкаў, 7 – у манастырах [5, с. 23]. Брацтва займаліся і ўнутраным ўладкаваннем царкоўных школ у епархіях: высылалі грошы на школьную меблю, дастаўлялі падручнікі і школьныя прылады, выдавалі сродкі на ацяпленне школ, на арэнду памяшканняў. Але нягледзячы на значныя намаганні праваслаўнага духавенства, царкоўна-прыхадскія школы былі створаны не ва ўсіх праваслаўных прыходах. Так, у 1891 / 1892 навучальным годзе ў Мінскай епархіі ўвогуле не было царкоўных школ у 64 прыходах, у Магілёўскай епархіі – у 23 прыходах. У Гродзенскай губерні ў 1889 / 1890 навучальным годзе ў 7 праваслаўных прыходах не было ні царкоўных, ні народных школ. Зноў звярнуліся за дапамогай да духавенства, але выкарыстоўваючы адміністратыўныя сродкі. Так, у 1891 г. Гродзенскае губернскае аддзяленне Літоўскага епархіяльнага вучылішчнага савета загадала настаяцелям усіх прыхадаў гэтай губерні абавязкова адкрыць школы граматы ва ўсіх вёсках, у склад якіх уваходзіла не менш за 30 двароў. Духавенства павінна было клапаціцца не толькі аб матэрыяльным забеспячэнні ніжэйшых духоўных установ, але і на свае сродкі ствараць бясплатныя вакансіі для бедных і здольных навучэнцаў. Так, Віленскае Свята-Духаўскае брацтва ў 1866 г. заснавала брацкую стыпендую ў імя святара Льва Зянковіча студэнту Літоўскай семінарыі [4, с. 23]. З мэтай матэрыяльнай падтрымкі бедным навучэнцам ў Мінскай семінарыі было створана ў 1886 г. Кірыла-Мяфодзьеўскае брацтва. У выніку значная колькасць сродкаў святароў расходвалася на арганізацыю школьнай справы. Духавенства было вымушана аплочваць шматлікія ўрадавыя праграмы, у тым ліку і ўтрыманне школ.

У кампетэнцыю брацтваў ўваходзілі пытанні ўкамплектавання настаўніцкага

персаналу. Спачатку фарміраваўся ён пераважна з асоб мясцовага духавенства, прадстаўнікоў царкоўнага прычту, а таксама выхаванцаў семінарый і вучылішч. Так, у Полацкай епархіі ў 1885 / 1886 навучальным годзе ў 72 школах выкладала 40 святароў і 8 псаломшчыкаў [9, с. 15]. Адначасова духавенства прымала актыўны ўдзел у падрыхтоўцы прафесійных настаўнікоў для адзначаных навучальных устаноў, якія павінны былі іх замяніць. У выніку, калі ў 1887 г. выкладала святароў-настаўнікоў – 77 асоб, то 1895 г. іх колькасць зменшылася да 14 [9, с. 15]. Выкананне духавенствам шэрагу сацыяльных функцый, а таксама шматлікія абавязкі на асноўнай пасадзе, прыводзілі да такіх здарэнняў, калі некаторыя святары ў школах не выкладалі Закон Божы асабіста, а даручалі псаломшчыкам і нават свецкім настаўнікам. Адметна тое, што святары займаліся выкладчыцкай дзейнасцю ў школах бясплатна, але праз брацтвы і іншыя царкоўна-грамадскія ўстановы знаходзілі сродкі на ўтрыманне настаўніцкага персаналу.

Як толькі брацтвы аддзяліліся ад епархіяльных вучылішчных саветаў, іх дзейнасць у справе народнай адукацыі скарацілася. Размяркаваннем сродкаў на патрэбы царкоўна-прыхадскіх школ займаліся вучылішныя саветы, а на забеспячэнні брацтваў заставаліся школы граматы. Адыход ад курыравання царкоўна-прыхадскіх школ дазволіў дзеячам брацтваў царкоўна-школьную справу трансфармаваць у іншыя накірункі асветніцкай дзейнасці. Так, напрыклад, савет Свята-Уладзімірскага накіраваў сваю дзенасць на рэлігійна-маральнае выхаванне дарослага насельніцтва Полацкай епархіі.

У пашырэнні асветы сярод насельніцтва праваслаўнае духавенства праз брацтвы выкарыстоўвала іншыя спосабы – стварала кніжныя склады, бібліятэкі. Паколькі публічныя народныя чытанні на рэлігійную тэматыку былі справай духавенства, менавіта яму належыць першынства ў арганізацыіі першых бібліятэк– чытален. Першая бібліятэка была створана у 1873 г. у Полацкай епархіі. Менавіта па ініцыятыве полацкага епіскапа Аляксандра былі распрацаваны правілы для адкрыцця народных бібліятэк і кніжных складоў духоўна-маральнага зместу пры цэрквах епархіі. Акрамя таго, правіламі дазвалялася ўладкоўваць

бібліятэкі ў будынках царкоўна-прыхадскіх школ. Намаганнямі духавенства ў 1895 г. у Полацкай епархіі іх колькасць складала 100. Бібліятэчны фонд фарміраваўся за кошт сродкаў брацтваў, асабістых ахвяраванняў святараў. А камітэт па выданню народных кніг і брашур пры Віленскім Свята-Духаўскім брацтве прапанаваў абавязкова выпісваць літаратуру ўсім прыхадскім цэрквам не менш 3 руб [3, с. 17-18].

У 60 – 90-я гг. ХІХ у Беларусі ва ўмовах актывізацыі царкоўна-прыхадскога жыцця пазіцыі духавенства ў асветніцкай справе становяцца даволі трывалыя. Неадназначна роля правслаўнага духавенства ў справе народнай пачатковай адукацыі. Ідэалагічны напрамак палітыкі царскага ўрада патрабаваў ад святароў пільнага нагляду за маральным і рэлігійным жыццём насельніцтва, што нярэдка супярэчыла прынцыпам духавенства. Але праваслаўнае духавенства выконвала свой грамадзянскі абавязак, прымаючы актыўны ўдзел у адкрыці для мясцовага насельніцтва пачатковых школ, а таксама бібліятэк.

Літаратура


1. Восович, С. Деятельность епархиальных братств Беларуси в сфере народного образования в 1865 – 1909 гг. // Православие в духовной жизни Беларуси –Брест: БрГУ, 2008. –295с.
2. Григоревский, М. Отчет о ревизии духовно-учебных заведений Минской епархии (1874) / М. Григоревский – Б.м., [1874] – 23 с.
3. Местные известия// Литовские епархиальные ведомости. – 1897. – № 3 (часть официальная). – С. 770 [7, с. 23]. 784.
4. Общее собрание Виленского Свято-Духовского брацтва [Б.М.: б.л., 1866]– 70с.
5. Отчет Могилевского епархиального училищного совета за 1886 – 1887 гг.
6. Отчет о состоянии церковно-приходских школ Полоцкой епархии за 1886/1887 учебный год // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1887. – № 24 (часть неофициальная). – С. 770 [7, с. 23]. 784.
7. Полунов, А. Церковь, власть, общество в России (1880-е-первая половина 1890-х годов.// Вопросы истории. – 1996. – №4. – С.127-136.
8. Римский, С. Российская церковь в эпоху великих реформ: (Церковные реформы в России 1860-1870-х гг.). – М., 1999. –532 с.
9. Серебренников, Н. Краткий историко-статистический очерк развития церковной школы Полоцкой епархии…/ Н. Серебренников….за 1884 – 1909 гг. – 26 с.